**24.** Дадзены прыклады: *1) урок; 2) сшытак; 3) падручнік.*

У якіх словах націск падае на другі склад?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**25.** Выберыце з прапанаваных словы-сінонімы да назоўніка *балота*:

*1) багна; 2) дрыгва; 3) пустыня.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**26.** Дадзены запазычаныя словы:

*1) мантаж; 2) фальш; 3) рубрыка.*

Падбярыце да іх беларускія адпаведнікі:

*а) падман; б) зборка; в) раздзел.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**27.** Драматычны твор з вясёлым зместам называецца … .

**А)** драма. **Б)** трагедыя. **В)** камедыя. **Г)** вадэвіль. **Д)** опера.

---

**28.** Дадзены прыклады:

*1) авіяцыя, піяніна; 2) педаль, метро; 3) збожжа, узвышша.*

Суаднясіце з патрэбнай арфаграмай:

*а) правапіс падоўжаных зычных;*

*б) правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах;*

*в) правапіс **е** ў першым складзе перад націскам у запазычаных словах.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**29.** Якое лексічнае значэнне мае назоўнік *бок*? Выберыце патрэбны(-ыя) прыклад(-ы):

*1) напрамак на мясцовасці; 2) прастора справа або злева ад сярэдняй лініі; 3) састаўная частка, элемент чаго-небудзь.*

**А)** усе прыклады. **Б)** 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 2, 3.

---

**30.** Якая народная казка пачынаецца словамі “Былі ў аднаго чалавека тры сыны”?

**А)** “Разумная дачка”. **Б)** “Музы́кі”. **В)** “Залаты птах”.
**Г)** “Ох і залатая табакерка”. **Д)** “Лісіца-хітрыца”.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 3. Тыраж 17500 экз. Мінск. 2026 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2026»

*Чацвер, 12 лютага 2026 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі слоў у народным выслоўі?

*Глыбокуювадунезамуціш.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**2.** У слове <u>рыб</u>*а* падкрэсленая частка з’яўляецца … .

**А)** прыстаўкай. **Б)** коранем. **В)** суфіксам. **Г)** канчаткам. **Д)** постфіксам.

---

**3.** З якой літары пачынаецца назва вялікай пералётнай птушкі з доўгай прамой чырвонай дзюбай і высокімі чырвонымі нагамі?

**А)** а. **Б)** б. **В)** ж. **Г)** ч. **Д)** ц.

---

**4.** Выберыце з прапанаваных назваў музычных інструментаў словы, якія маюць два склады:

*1) скрыпка; 2) арфа; 3) гітара; 4) барабан.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**5.** Якую літару неабходна прыбраць у слове *пілот*, каб атрымалася назва агароджы, пераважна з жэрдак?

**А)** п. **Б)** і. **В)** л. **Г)** о. **Д)** т.

**6.** Выберыце з дадзеных пытальны сказ.

*1. Прыгожая наша краіна!   2. Як трапляе хлеб на стол?*

*3. Глядзяць у неба сінія азёры.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**7.** У якім склоне назоўнікі адказваюць на пытанне *чым*?

**А)** у назоўным склоне. **Б)** у давальным склоне. **В)** у вінавальным склоне. **Г)** у творным склоне. **Д)** у родным склоне.

---

**8.** Якая літара ў беларускім алфавіце ідзе за літарай ***ж***?

**А)** е. **Б)** ё. **В)** з. **Г)** і. **Д)** к.

---

**9.** Выберыце правільна напісаныя словы:

*1) дуп;   2) мурашка;   3) знахотка;   4) посуд.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**10.** Дадзены малюнкі фігур:



*1)   2)   3)*

Якая іх форма:

*а) круглая;   б) чатырохвугольная;   в) трохвугольная?*

Суаднясіце малюнак і форму фігур.

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**11.** Дадзены сказ:

*Вясной прыгожа квітнее наш сад.*

Колькі словазлучэнняў у сказе?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**12.** Колькі гукаў у слове *ясень*?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**13.** Дадзены прыклады:   *1) канапа;   2) лесавік;   3) юнак.*

Выберыце адушаўлёныя назоўнікі.

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**14.** Дадзены словазлучэнні:

*1) рачн.. глыб;  2) аўтамабільн.. сэрвіс;  3) вясков.. сявец;  4) нов.. бра.*

Выберыце прыклады, у якіх прыметнікі маюць канчатак ***-ы***.

**А)** усе прыметнікі. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**15.** Вызначце з прапанаваных словы, якія маюць мяккія зычныя гукі:

*1) яхта;   2) сябар;   3) зіма.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**16.** Прачытайце ўважліва назвы: *1) жарабя; 2) цяля; 3) ягня*.

Суаднясіце назвы з малюнкамі:



*а)   б)   в)*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**17.** Як называецца каўпак для лямпы?

**А)** аазіс. **Б)** абажур. **В)** абаранак. **Г)** абгортка. **Д)** абруч.

---

**18.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Петруся Броўкі:

*– Калі ласка! – нашай роднай мовы*

*Шчырыя і ветлівыя словы.*

Колькі ўсяго прыметнікаў ужыта?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**19.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў прыказцы слова?

*У лес **дроў** не возяць.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем. **Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

---

**20.** Дадзены прыклады:

*1) бусел, сава;   2) мядзведзь, ліса;   3) сцюжа, гром.*

Як назваць назоўнікі ў кожным з трох прыкладаў адным словам?

*а) жывёлы;   б) з'явы прыроды;   в) птушкі.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**21.** Закончыце сказ, не змяняючы форму слоў.

*Вучні чыталі цікавае … .*

**А)** паэму. **Б)** апавяданне. **В)** аповесць. **Г)** легенду. **Д)** казку.

---

**22.** Вызначце з дадзеных няправільна напісаныя словы:

*1) дрыўляны;   2) яблачны;   3) вадзяны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**23.** Выберыце з прапанаваных словы, у якіх на месцы пропуску напішаце літару ***о***:

*1) в..рона;   2) н..ра;   3) гор..д.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.